1933 г. – пропаганда печатью организационно-хозяйственного укрепления колхозов в условиях завершения сплошной коллективизации [3].

Таким образом, при изучении материалов периодической печати, исследователю необходимо использовать как традиционные методы анализа документальных источников, так и качественно-количественный анализ (контент-анализ), что позволяет обеспечить подход к материалам периодической как к особому виду исторических источников, обладающему внутренним единством и непрерывностью и получить новые данные.


1. Беларуская Вёска. – 1930. - №28. – 8 марта
2. Костюк, М.П. Идейно-политическое воспитание крестьянства. Из опыта работы КПБ в период строительства социализма 1926-1937гг. / М.П.Костюк. - Мн.:Беларусь,1979. – 254с.
3. Марцелев С.В. На путях строительства социализма: Печать Белоруссии 1926-1937гг./ С.В.Марцелев - Мн.: Беларусь, 1972. – 312с.
4. Национальный архив Республики Беларусь, ф.4п, оп.1, д. 5483 л. 380
5. Победа колхозного строя в Белорусской ССР / М.П.Костюк, В.А.Полуян, А.Н.Сорокин и др. – Мн.: Наука и техника, 1981. – 422с.



**Пушкін І.А.**


## БЕЛАРУСКАМОЎНЫЯ АДОЗВЫ ЯК КРЫНІЦЫ ПА НАЦЫЯНАЛЬНАМУ АНТЫСАВЕЦКАМУ СУПРАЦІВУ Ў БССР

Асноўная частка дакументаў па нацыянальнаму, антысавецкаму супраціву ў БССР захоўваецца ў архівах КДБ, да якіх даследчык мае абмежаваны доступ. Але ж спазнаць рэальнае грамадска–палітычнае жыццё Беларусі ў 1920–30-х гадах магчыма пры знаёмстве з інфармацыйнымі зводкамі, справаздачамі ДПУ, камітэтаў КП(б)Б па асобных тэрытарыяльных адзінках, якія складаліся ў некалькіх асобніках. Адзін з іх абавязкова дасылаўся ў мясцовыя і цэнтральныя кіраўнічыя органы КП(б)Б. Іх шмат захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці (ДАВц), Дзяржаўных архівах грамадскіх аб’яднанняў Гомельскай (ДАГАГом) і Магілёўскай (ДАГАМаг) абласцей.

Сучасныя даследаванні засведчылі, што ў Беларусі ў 1920–30-я гг. частка насельніцтва не ўспрымала савецкую дзяржаву як сваю і трактавала бальшавіцкую ўладу як нелігімітымную. Выступленні насельніцтва супраць парадку кіравання на абшарах Савецкай Беларусі можна падзяліць на некалькі груп. Паўстанні і выступы з акрэсленай палітычнай праграмай: з мэтай рэстаўрацыі дарэвалюцыйнага ладу; аднаўлення буржуазна–дэмакратычных свабод, якія былі атрыманы ў ходзе Лютаўскай рэвалюцыі, і з заклікам да перадачы ўлады Устаноўчаму сходу; нацыянальна–вызваленчыя паўстанні і з заклікамі да незалежнасці Беларусі. Былі паўстанні і выступы без акрэсленай палітычнай праграмы, выкліканыя эканамічнай палітыкай бальшавікоў [2; 5; 8; 9; 10; 11; 12].

Беларускія нацыянальныя арганізацыі, якія імкнуліся да стварэння беларускай незалежнай дзяржавы, – гэта “Брацтва беларускае”, “За Радзіму”, “Зялёны дуб”. Яны мелі ваенную структуру і узаемадзейнічалі паміж сабой. Найбольш буйным быў “Зялёны дуб”, ваенная арганізацыя паўстанцкага характару, ён налічваў у 1921 г. каля 5000 чалавек [9; 12].

Значную ролю ў разгортванні грамадскага руху, які накіраваны супраць існуючай улады, адыгрывае агітацыя і прапаганда. Найбольш шырока распаўсюджанай формай былі адозвы або лістоўкі (улёткі). Гэта від літаратуры і сродак масавай інфармацыі актуальны паводле зместу і аператыўны ў распаўсюджанні. Яны выдаюцца эпізадычна з агітацыйнымі, прапагандысцкімі, інфармацыйнымі, выхаваўчымі і да таго падобнымі мэтамі. Выконваюцца ў выглядзе аркушаў паперы малога або сярэдняга памеру з рукапісным ці друкаваным тэкстам. Тэкст можа быць арыгінальны (адозвы, аб’явы) або запазычаны з іншых крыніц (афіцыйныя дакументы, мастацкія творы).

На тэрыторыі Беларусі рукапісныя лістоўкі, вядомыя з 17 ст., выкарыстоўваліся ў прыватнасці ў ходзе вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. На беларускай мо-

Рэпазіторый ВГУ

ве выдаваліся лістоўкі падчас паўстання 1863–1864 гг. У выглядзе лістовак выходзілі нумары легендарнай газеты “Мужыцкая праўда” К.Каліноўскага. Больш за 3 млн. асобнікаў лістовак выдадзена на тэрыторыі Беларусі ў перыяды развалу Расійскай імперыі ў 1917 г., нямецкай і польскай акупацый 1918–1920 гг. У гады Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі выдавалі і распаўсюджвалі лістоўкі ўсе супрацьстаячыя бакі. Вядомыя выданні: беларускія – савецкія (каля 11 тыс. назваў), калабарацыянісцкія і незалежніцкія, нямецкія акупацыйныя, польскага падполля (Арміі Краёвай), украінскай незалежніцкай партызанкі (УПА) і інш. Лістоўкі шырока выкарыстоўваецца ў сучасных перадвыбарчых кампаніях, у дзейнасці палітычных партый і грамадскіх арганізацый, рэкламных акцыях [6].

У Беларусі не шмат захавалася агітацыйнага матэрыялу, які быў створаны на беларускай мове. Захаваліся адзінкі беларускамоўных адозваў і лістовак антысавецкага зместу. Вялікай рэдкасцю з’яўляюцца лістоўкі, створаныя ў выглядзе верша. Найбольш вядома падобная агітацыя, якая праводзілася ў Слуцкім раёне ў час дзейнасці (1924–1925 гг.) нелегальнай антысавецкай групы пад кіраўніцтвам Юркі Лістапада [4, с. 191–192].

Таму вялікую каштоўнасць уяўляюць нядаўна знойдзеныя ў Магілёўскім архіве дакументы. У адным з іх распавядаецца аб з’яўленні ў м. Глуск (сёння райцэнтар Магілёўскай вобласці, знаходзіцца паміж Слуцкам і Бабруйскам) лістовак (пракламацый), якія былі рэакцыяй на гвалтоўнае правядзенне калектывізацыі.

Лістоўкі былі надрукаваны на аркушы звычайнай паперы (памер прыкладна 20 х 28 см.) у вершаванай форме і на беларускай мове ў выглядзе звароту да акадэміка АН БССР Я.Коласа. Адбітак адной з іх захоўваецца ў фондзе Бабруйскага АК КП(Б)Б як дадатак да інфармацыйнага паведамлення ад 08.02.1930 г. [7]

Тут упершыню публікуюцца змест часткі дакумента і цалкам лістоўка на мове арыгіналу, з захаваннем асаблівасцяў, арфаграфічных памылак, якія маюцца ў тэксце. У вершаваных радках амаль цалкам адсутнічаюць знакі прыпынку. Прозвішча паэта Ц.Гартнага надрукавана з маленькай літары. На нашу думку, у першым слупку 8 радок трэба чытаць – спіцe, 9 – праткнулі, 10 – эшалоны, у другім слупку 24 радок – гняздзе. У нізе лістоўкі надрукаваны вершаваныя радкі на рускай мове.

№ 178/с ЦК КП(Б)Б Сакрэтна
ад 8/02 – 30 г.
Аб клясавай барацьбе, контррэвалюцыйнай
агітацыі і урадзіцельстве куластва
… У сувязі са шпаркімі тэмпамі росту каляктывізацыі і ліквідацыяй куластва як кляса маецца шэраг выпадкау, акрамя усіленнай агітацыі проціу калгаснага будауніцтва, метады барацьбы адкрыты тэррар, урадзіцельства і г.д.
У Глусскім раене у ноч на 26/1 – 1930 г., у м. Глуску былі расклеяны контррэвалюцыйныя пракламацыі (копія прыкладаецца). …

Заг. інфармацыі Бабруйскага АК КП(б)Б САЛАДУХІН

Копия прокламации
Кому гор. МИНСК Академия НАУК Якубу КОЛАСУ

Эй гартны, Колас і Купала
Нібы памерлі Вы ня стала
Паперы Вам чарніл?
Ужо цяпер ня мае сіл
Як пры цару дык вы сьпявалі
Дзе была гора вы казалі
Цяпер жа усе Вы маучыце

Не гэта хлеба не хапіла
І у некаторых бульба не урадзіла
Так гэта іх за то вядуць
У той страшны нявядомы пуць
Ня мала тысяч і папала
За тое што бульбы не хапіла
У той страшны белый дом



Рэпазіторый БГУ

Нібы глухія, бы сьціце
А можа горла Вам пратанулі
Глядзеце ашалены ідуць
У турму таварышы вядуць
Людзей па твару Вам знаемых
Даугія косы кароткі вус
Прыглянцесь, гэта ж беларус
У падранай сьвітцы і у лапцех
З мазолем кроуным на руках
Да дня на працу ен уставау
Да ночы у полі прабываў
Бедняга біуся з усіх сіл
За тое воддых заслужыу
Яго з вінтоукамі вядуць
У незнаемы яму пуць
Ні дзед ні прадзед, а ніколі
Ня былі у гэтым страшным доме
За што ж яны туды папалі
А можа што яны укралі

З савецкім што стаіць гербом
Вы ж гэтак добра у сваіх вершах
Насільле злое заклеймілі
Чаму ж цяпер Вы маучыце
А можа голаса лішылі
А можа Вы зьмянілі шкуру
Вайтамі сталі ужо служыць
Забралі хлеб забралі бульбу
І нашу кровь схацелі піць
За нашу працу, за нашу шчырасьць
Вы нас у турму паслалі гніць
За тое, што Вас мы пакармілі
Вашэй паслалі шчэ карміць
А можа Вам зусім ня відна
З акадэміі НАУК
Або любуецесь Вы жэртвай
Як на сваім зняздзе паук

Пройдет года все на свете
Кошмар насилия пройдет
Вы будете тогда в ответе
И суд история возьмет

И за молчание перед светом
Она Вас разве наградит
О нет советские поэты
Позором страшным заклеймит

Бобруйск 11/Х11 1929 года

На нашу думку, напісаў гэты верш-зварот да паэтаў Ц.Гартнага, Я.Купалы, Я.Коласа паэт-пачатковец або настаўнік. Цікавая акалічнасць: у 1930 г. Глускую сямігодку скончыў будучы паэт Сяргей Грахоўскі [1, с. 245]. Спакуслівa выглядае гіпотэза, што менавіта ён аўтар радкоў. А можа хтосьці з былых "лістападаўцаў". Варта параўнаць прапанаваны тэкст з іх жыццёвым лёсам, заклікамі і зместам лістовак, якія яны распаўсюджвалі сярод насельніцтва.

Слуцкая арганізацыя была выкрытая ДПУ. У сакавіку 1926 г. іх судзілі. Ю.Лістапада (ён быў галоўны абвінавачаны), Нічыпара Мяцельскага і іх найбліжэйшых паплечнікаў – Міхася Макарэню, Міколу і Рыгора Казакоў, Міхася Дзямідовіча – засудзілі на тэрмін ад трох да пяці гадоў. Ю.Лістапад быў у 1927 г. амніставаны, доўгі час не мог уладкавацца на працу. Зарабляў грошы як "вольны перакладчык" у Белдзяржвыдавецтве. Улетку 1930 г. арыштаваны па "справе Саюзу вызвалення Беларусі", але праз некалькі месяцаў выйшаў на волю (у 1934 г. зноў арыштаваны, у 1938 г. расстраляны) [11].

Арганізацыя Ю.Лістапада ставіла перад сабою мэту праводзіць нацыянальную асветніцкую працу, антыкамуністычную прапаганду, каб потым, стварыўшы шырокую сетку збройных аддзелаў, узняць паўстанне і вызваліць Беларусь ад чужынцаў. Працу сваю патрыёты меліся весці не толькі ў БССР, але і ў Заходняй Беларусі, што была тады пад Польшчай.

Яны выдавалі беларускі часопіс "Наша слова". З яго старонкак гучалі заклікі: "Бальшавікі забіраюць наш хлеб і кормяць сваю Расію", "Хопіць стагнаць. Давайце будаваць уласную дзяржаву – Беларусь. Народ паўстань!" [3, с. 6]. "Браты родныя! Абрыдла нам панаванне чужынцаў – і камуністаў, і паноў. Трэба нам паўстаць і збудаваць вольную незалежную Беларусь", – звярталіся маладыя патрыёты да насельніцтва. Адна з лістовак, якія распаўсюджваліся сярод жыхароў Слуцка і ваколіцаў, змяшчала наступны верш, падпісаны псеўданімам Малы Язэп:



Репозиторий ВГУ

Паўстань!
Ня сьпі, мой любы селянін!
Паўстань супроць чужой улады!
Паўстаньне – сродак твой адзін,
Ты роднай Бацькаўшчыны сын,
Сваіх ня згубіш пуцявін,
Дык не шукай чужых спагады!
За зброю! Бі! Хай гінуць гады!
Паўстань! Ня бойся і ня трусь!
Ратуйма нашу Беларусь!

Такім чынам, беларускамоўныя адозвы маюць ярка выражаны нацыянальны і патрыятычны змест. Іх аўтары былі перакананымі змагарамі за вольную Бацькаўшчыну–Беларусь. Выяўленыя новыя дакументы з'яўляюцца важнай крыніцай па гісторыі нацыянальнага антысавецкага руху ў Беларусі ў міжваенны перыяд.


1. Беларускія пісьменнікі: Бібліягр. слоўн. У 6 т. Т. 2 / Пад рэд. А.В. Мальдзіса; Рэкал.: І.Э. Багдановіч і інш. – Мінск: БелЭн, 1993. – 541 с.
2. Віцьбіч, Ю. Антыбальшавіцкія паўстанні і партызанская барацьба на Беларусі / Ю.Віцьбіч. – Нью–Ёрк: БІНІМ, 1996. – 398 с.
3. Гігін, В.Ф. Разгром небальшавіцкіх палітычных партый і груп на тэрыторыі Савецкай Беларусі ў першай палове 1920-х гг. / В.Ф.Гігін // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 10. – С. 6.
4. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А.Вабішэвіч [і інш.]; рэдкал. М.Касцюк (гал.рэдактар) і інш. – Мінск: Экаперспектыва, 2006. – 613 с.
5. Грыцкевіч, А.П. Слуцкае паўстанне 1920 г. / А.П.Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6 / Беларус.Энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – С. 347–348.
6. Ермаловіч, В. Лістоўка / В. Ермаловіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4 / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1997. – С. 374.
7. Інфармацыйнае паведамленне Бабруйскага АК КП(Б)Б ад 08.02.1930 г. // ДАГАМаг. – Фонд 6575. – Воп. 1. – Спр. 770. – Арк. 95–96.
8. Кузьміч, В.М. Нелегальная дзейнасць на беларускім участку савецка-польскага памежжа (1921–1939 гг.) / В.М.Кузьміч // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2008. – № 1. – С. 53–61.
9. Латышонак, А. Жаўнеры БНР / А.Латышонак. – Беласток: БГТ, 2009. – 366 с.
10. Пушкін, І.А. Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі (20–30-я гады ХХ ст.): дакументы і матэрыялы / І.Пушкін. – Мінск: Медысонт, 2009. – 192 с.
11. Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах / Ул.Ляхоўскі, Ул.Міхнік, А.Гесь. – Мінск: "Энцыклапедыкс", 2001. – 274 с.
12. Стужынская, Н.І. Беларусь мяцежная: з гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву: 20-я гг. ХХ ст. / Н.І.Стужынская. – Вільня: Беларуская жаночая ліга, 2000. – 255 с.


**Дулаў А.М.**

## ЛІСТЫ Г.С. ЕЎДАКІМЕНКІ ЯК КРЫНІЦА ПРА ДЗЕЙНАСЦЬ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ВІЦЕБСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДІНСТЫТУТА НА МЯЖЫ 1930–1940-х гг.

Навуковае вывучэнне перыяду 1930-х гг. у дзейнасці гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава толькі пачынаецца. Асноўнымі крыніцамі звестак з'яўляюцца матэрыялы афіцыйнага справаводства факультэта, якія захоўваюцца ў складзе фонда педагагічнага інстытута ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці [1]. Аднак патэнцыял гэтых крыніц ў даследаванні шэрага аспектаў, у прыватнасці, вучэбнага працэсу праз прызму ўспрыняцця тагачасных студэнтаў, студэнцкага паўсядзённага жыцця, даволі абмежаваны. На жаль, да нядаўняга часу нам былі невядомыя і крыніцы асабістага паходжання, якія б утрымлівалі інфармацыю па акрэсленых праблемах. У пэўнай ступені выправіць сітуацыю ўдалося выпадкова.

Напрыканцы лютага 2011 г. газета "Аргументы и факты в Белоруссии" змясціла фотаздымак студэнтаў гістфака ВДПІ імя С.М. Кірава набору 1938 г., зроблены пасля заканчэння імі другога курса, і невялічкі допіс аднаго з тых студэнтаў – Георгія Савіча



Рэпазіторый ВДУ